СУСТРЭЧЫ

# РОДНАЙ МОВЫ ПЕРАЛІВЫ

Дзень 16 кастрычніка 2025 года ў СШ №19 г. Гродна быў незвычайным. Для вучняў пачатковых класаў ён прайшоў пад дэвізам: «Багацце наша – у роднай мове» і быў прысвечаны, як можна здагадаца, – роднай мове. У гэты дзень школьнікі паўдзельнічалі ў конкурсе «Перакладчык» і ў інтэлектуальным турніры «Лепшы знаўца роднай мовы». У літаратурнай гасцёўні «Роднай мовы пераліва», вучні сустрэліся з гродзенскімі дзіцячымі пісьменніцамі Таццянай Аркадзьеўнай Сучковай і Ганнай Іосіфаўнай Скаржынскай-Савіцкай.

Гасцей-пісьменніц дзеці віталі іх вершамі, а Таццяна Аркадзьеўна і Ганна Іосіфаўна падарылі ім свае новыя творы.

Таццяна Сучкова пазнаёміла прысутных з новай кнігай-пераможцай IV абласнога літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Цёткі (2022) «Сонечная карусель». Пачытала вершы, гумарэскі. Таксама гучалі творы з кнігі «Зялёнае лета». Вучні з цікавасцю слухалі вясёлыя вершы паэткі, адгадвалі загадкі, цікавіліся яе творчасцю – задавалі пытанні. Асабліва ўразілі творы з кнігі «Я намалюю дзіўную краіну», таму што яны цёплыя, прысвечаны маці, сябрам, Радзіме. На памяць пра сустрэчу Таццяна Аркадзьўена падарыла дзецям свае кнігі. Расказала пра тое, над чым працуе цяпер, адкуль чэрпае творчае натхненне.

Ганна Скаржынская-Савіцкая расказала, чым пераліваецца родная мова ў яе ўяўленні: яна цурчыць ручайком, спявае жаўруком, шапоча лісцем, зіхаціць вясёлкай, свеціць сонейкам, гучыць любоўю да Радзімы. Дадала, што мова наша – мілагучная, кранальная, непаўторная. Пісьменніца пачытала вершы пра восень. Расказала і паказала дзецям любімы часопіс на беларускай мове «Буся», у якім доўгі час друкуецца цыкл яе выхаваўчых казак «Пра мядзведзіка Мішку». У фінале выступоўца пазнаёміла маленькіх чытачоў з кнігай «Кветка малой радзімы», у якой змешчаны апавяданні і казкі на тэму беларускіх прыказак і прымавак, каб нагадаць слухачам пра народныя мудрынкі-залацінкі. Таму што вучняў чакала гульня «Прыказкі і прымаўкі – роднай мовы прывязкі».

Сустрэчы з цікавымі людзьмі заўсёды застаюцца ў памяці. Думаецца, што гэтае мерапрыемства таксама пакіне глыбокі след у дзіцячых сэрцах.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** падчас наведвання гродзенскай сярэдняй школы № 19 дзіцячымі пісьменніцамі Таццянай Сучковай і Ганнай Скаржынскай-Савіцкай. Кастрычнік 2025 года.





*Ганна Скаржынская-Савіцкая*



*Таццяна Сучкова*








*Школьніцы вітаюць гасцей іх вершамі*




*Адгадваем загадкі*




*Пісьменніцы з настаўніцамі-арганізатарамі*




*З дзяўчынкамі-вучаніцамі*



*Агульны фотаздымак пісьменніц з вучнямі на памяць аб сустрэчы*

Государственное учреждение образования
"Средняя школа №19 г.Гродно"